А.Р. Агееў

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДАЎ АЎСТРАЛІІ І АКІЯНІІ

Магілёў 2007

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
імя А.А. КУЛЯШОВА"

**А.Р. Агееў**

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДАЎ АЎСТРАЛІІ І АКІЯНІІ

Метадычныя рэкамендацыі
для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта

Магілёў 2007

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 39(931/96)(075.8)
ББК 63.5(3)
A23

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага
І экспертнага савета МДУ імя А.А. Куляшова*

**Рэцэнзенты:**
кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры грамадскіх дысцыплін УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання" *І.А. Пушкін;*

кандыдат гістарычных навук прафесар кафедры гісторыі і культуры Беларусі УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова"
*П.Ф. Дзмітрачкоў*

**Агееў, А.Р.**

A23 Традыцыйная культура народаў Аўстраліі і Акіяніі: метад. рэкамендацыі для студ. 1 курса гістарыч. фак. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 36 с.

Метадычныя рэкамендацыі для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта раскрываюць асаблівасці матэрыялу тэмы "Этнічныя супольнасці Аўстраліі і Акіяніі" курса "Этналогія". Яны прызначаны аблегчыць засваенне імі вучэбнага матэрыялу на занятках і ў працэсе самастойнай работы.

**УДК 39(931/96)(075.8)**
**ББК 63.5(3)**

© Агееў А.Р., 2006
© МДУ імя А.А. Куляшова, 2007

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАДМОВА

Курс "Асновы этналогіі" з'яўляецца адной з дапаможных вучэбных спецыяльных дысцыплін, якая вызначае прафесійную падрыхтоўку гісторыка ў адпаведнасці з патрабаваннямі кваліфікацыйных характарыстык спецыяльнасцей **1-21 03 01; 1-21 03 01-01; П.02.01.03.** Праграмны матэрыял вывучаюць студэнты першага года навучання. Змест курса ў адпаведнасці з праграмай размеркаваны па тэмах лекцыйных і семінарскіх заняткаў, частка матэрыялу вылучана для самастойнага вывучэння.

Галоўнай мэтай курса з'яўляецца азнаямленне студэнтаў з этнічнай гісторыяй чалавецтва і культурай асноўных этнічных супольнасцяў розных рэгіёнаў планеты пры дапамозе параўнальна-гістарычнага і гісторыка-генетычнага метадаў. Адначасова ставяцца задачы фарміравання цэласных трывалых ведаў па этналогіі, абагульнення разнастайных гістарычных ведаў па этнічных праблемах; развіцця ў студэнтаў этналагічнага мыслення і ўмення самастойна аналізаваць і параўноўваць матэрыял; выхавання ў студэнтаў паважлівых адносін да іншых культур і народаў.

Тэма "Традыцыйная культура народаў Аўстраліі і Акіяніі" з'яўляецца першай у плане сярод тэм курса, у якой раскрываецца этнічная культура аднаго з рэгіёнаў нашай планеты. Яна вывучаецца як на лекцыях, так і на семінарскіх занятках. Важнасць вывучэння гэтай тэмы вызначаецца не толькі неабходнасцю засваення праграмнага матэрыялу, але і тым, што структура яе тыповая і паўтараецца пры выкладанні культуры этнасаў іншых рэгіёнаў свету. У ёй паказваецца алгарытм вывучэння наступных падобных тэм.

Аўстралія і Акіянія здаўна цікавілі этнолагаў сваімі вельмі архаічнымі формамі гаспадаркі і культуры, якія да нядаўняга часу яшчэ добра захоўваліся. Гаспадарка абарыгенаў Аўстраліі адносілася да гаспадаркі культурнага тыпу паляўнічых і збіральнікаў. Цяжкія прыродныя ўмовы і аддаленасць ад іншых этнасаў свету тармазілі развіццё аўстралійскіх народаў, у выніку чаго яшчэ ў канцы XVIII ст. яны не ведалі земляробства і жывёлагадоўлі. Папуасы і акіянічныя народы ўжо дасягнулі стадыі ручных земляробаў і рыбакоў. Паслядоўнае вывучэнне культуры абарыгенаў Аўстраліі, папуасаў Новай Гвінеі, этнасаў Меланезіі, Палінезіі і Мікранезіі дазваляе ўбачыць эвалюцыю матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў свету



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і іх асобных складальнікаў. На базе атрыманых падчас вывучэння гэтай тэмы ведаў значна лягчэй ідзе засваенне студэнтамі матэрыялаў наступных тэм вучэбнага курса.

Метадычныя рэкамендацыі ўтрымліваюць скарочаны тэкст лекцыі, пытанні для самакантролю, тэматыку рэфератаў, слоўнік неабходных для вывучэння тэмы тэрмінаў і асноўную літаратуру па тэме. Матэрыял лекцыі выкладаецца ў адпаведнасці з традыцыйна прынятым падзелам гэтага рэгіёна планеты на гісторыка-этнаграфічныя вобласці: Аўстралію, Новую Гвінею, Меланезію, Палінезію і Мікранезію.

## АЎСТРАЛІЙСКІЯ АБАРЫГЕНЫ

### Геаграфічная характарыстыка

Аўстралія – найменшы і самы нізкі мацярык нашай планеты. Яго плошча складае 7631,5 тыс. км$^2$, а сярэдняя вышыня ўсяго 215 м над узроўнем сусветнага акіяна. Самая высокая кропка Аўстраліі названа ў гонар нашага славутага земляка, нацыянальнага героя Польшчы і ЗША – Тадэвуша Касцюшкі (2230 м). Праўда, у пачатку XXI ст. урад Аўстраліі ў межах праграмы па вяртанні геаграфічным аб'ектам назваў, якія ім далі ў свой час абарыгены, прыняў рашэнне аб перайменаванні вяршыні. Нягледзячы на малыя памеры, Аўстралія здаўна цікавіла этнолагаў сваімі вельмі архаічнымі формамі гаспадаркі і культуры, якія да нядаўняга часу яшчэ захоўваліся.

### Гісторыя засялення

Кантынент быў заселены людзьмі, верагодна, каля 40 тыс. гадоў назад. Абарыгены Аўстраліі ў XVIII ст. жылі па ўсім мацерыку і складалі 250–300 тыс. насельніцтва.

Некаторыя студэнты тэрмін “**абарыгены**” атаясамліваюць менавіта з карэннымі аўстралійцамі. На самой справе ён паходзіць ад лацінскага слова і азначае: карэнныя насельнікі краіны, мясцовасці (людзі, расліны, жывёлы). Абарыгенамі называлася племя, што жыло каля падножжа Апенінаў паводле старажытнарымскага падання.

Галандцы, а потым і партугальцы першымі ў XVII ст. ступілі на зямлю Аўстраліі, у наступным стагоддзі гэтая частка свету стала англійскай калоніяй. У 1788 г. на кантынент была прывезена першая



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

партыя катаржан Яе Вялікасці Каралевы Вялікабрытаніі. Напачатку Аўстралія была “вострававам катаржан” і злачынцаў, якіх ссылалі сюды навечна, а таксама наглядчыкаў і паліцэйскіх, якія за імі наглядалі.

З 1830-х гг. пачалася сістэматычная каланізацыя краіны. “Залатая ліхаманка” 1850-х гг. рэзка павялічыла прыток імігрантаў, што паспрыяла паступоваму адцясненню абарыгенаў у неўрадлівыя цэнтральныя і паўночныя раёны ўнутранай Аўстраліі. У выніку палітыкі асіміляцыі іх колькасць скарацілася да 40 тыс. у 1966 г. Сёння абарыгенаў і метысаў налічваецца недзе 250 тыс., пры насельніцтве краіны амаль у 20 млн чалавек.

## Антрапалагічная характарыстыка

Аўстралійскія абарыгены адносяцца да асобнага тыпу аўстралоіднай расы. У карэнных аўстралійцаў буры колер скуры, цёмныя хвалістыя валасы, цёмныя вочы, шырокі нос і тоўстыя губы, сярэдні і высокі рост, сярэднія па памерах твары з добра развітымі надброўнымі дугамі. У адрозненні ад негроідаў Афрыкі ў абарыгенаў развітае трацічнае валасяное покрыва.

## Лінгвістычная сітуацыя

Абарыгены Аўстраліі размаўляюць больш чым на 200 мовах. У сувязі з моцнымі адрозненнямі дыялектаў некаторыя мовазнаўцы налічваюць да 600 аўстралійскіх моў. Лінгвісты па розных класіфікацыях аб’ядноўваюць іх у 16–25 моўных сямей.

Аўстралійскія мовы дужа ізаляваныя і непадобныя на мовы іншых народаў. У большасці моў маецца 3 галосныя (i, a, u), няма свісцячых, шыпячых, не адрозніваюцца глухія і звонкія гукі. Як і ў большасці народаў, якія знаходзіліся на падобнай аўстралійцам стадыі сацыяльна-эканамічнага развіцця, мовы абарыгенаў бедныя на абстрактныя паняцці, у іх мала слоў, якія абазначаюць колькасць.

## Гаспадарка і матэрыяльная культура аўстралійцаў

Гаспадарка абарыгенаў адносілася да гаспадаркі культурнага тыпу паляўнічых і збіральнікаў. Цяжкія прыродныя ўмовы і аддаленасць ад іншых этнасаў свету тармазілі развіццё аўстралійскіх народаў, у выніку чаго яшчэ ў канцы XVIII ст. яны не ведалі земляробства і жывёлагадоўлі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Асноўным аб'ектам палявання былі кенгуру і іншыя сумчатыя жывёлы, птушкі. Аўстралійцы практыкавалі як актыўныя, так і пасіўныя метады палявання. Найбольш пашыраным было актыўнае індывідуальнае паляванне, калі паляўнічы адзін высочвае, заганяе і забівае жывёлу, і актыўнае калектыўнае паляванне, калі палявалі некалькі абарыгенаў.

Аўстралійцы – адзіныя ў свеце народы, якія не ведалі лука і стрэлаў (магчыма, яны існавалі на поўначы на паўвостраве Ёрк). Палявалі яны з дапамогай коп'яў, кідальных паліц, у тым ліку **бумерангаў**. Коп'і і паліцы абарыгены кідалі і з дапамогай кап'якідальнікаў. Выкарыстоўваліся таксама сілкі і пасткі. Прылады працы, у тым ліку нажы і сякеры, былі каменнымі, касцянымі, драўлянымі, выраблялiся з ракавін.

Парадокс гістарычнага развіцця Аўстраліі заключаецца ў тым, што ў эпоху верхняга палеаліту аўстралійцы валодалі адной з самых перадавых тэхналогій апрацоўкі камню. Ужо 23 тыс. гадоў таму яны ўмелі вырабляць сякеры, якія шліфаваліся па краі. Менавіта на гэтым кантыненце зафіксаваны адны з самых ранніх знаходак падобных сякер. Але потым прагрэс тэхналогіі апрацоўкі камню ў гэтай частцы свету запаволіўся. На момант прыходу еўрапейцаў абарыгены валодалі мезалітычнай і ранненеалітычнай тэхналогіямі. Металу яны не ведалі.

Аўстралійцы звычайна не займаліся рыбнай лоўляй, бо на кантыненце мала вадаёмаў. Тым не менш яны ведалі кручкі, сеткі, кошыкі, гарпуны і астрогі. Практыкавалася і выкарыстанне раслiннай атруты, якую запускалі ў вадаёмы і рэкі.

У аўстралійцаў існаваў палавы падзел працы: паляваннем займаліся мужчыны, збіральніцтвам – жанчыны і дзеці. Жанчыны працавалі з дапамогай завостраных палак. Жаночае і дзіцячае збіральніцтва забяспечвала 65–70% (2/3) харчавання, што тыпова для гаспадаркі паляўнічых і збіральнікаў.

Аўстралійцы ўмелі захоўваць сабраныя караняплоды, у тым ліку дзікі ямс, закопваючы іх у зямлю. Гэта дало падставы этнолагам сцвярджаць, што “аўстралійцы стаялі на парозе земляробства”. Верагодна, так і адбываўся пераход да земляробства ў іншых рэгіёнах планеты. Людзі забывалі месцы прыхаваных прыпасаў, потым бачылі ўсходы, а потым і павелічэнне ўраджаю. Аўстралійцам заставалася зрабіць адзін крок у гэтым накірунку.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Вобраз жыцця** аўстралійцаў быў качавым. Рухаліся яны ўслед за міграцыямі жывёл. Сталых пасяленняў абарыгены не стваралі.

**Жылля** ў сувязі з цёплым кліматам і качавым вобразам жыцця ў аўстралійцаў фактычна не існавала. Яны выкарыстоўвалі пячоры, рабілі ўслоны ад ветру, шалашы, прымітыўныя хаціны.

**Адзенне** абарыгены не ведалі ў сувязі з пераважна цёплым кліматам і хадзілі голымі. Яны ўпрыгожвалі цела пацеркамі, завушніцамі, татуіроўкамі. У некаторых плямён існавалі набедраныя павязкі, паясы з фартухамі.

**Кулінарыя** была даволі прымітыўнай. Ежу гатавалі без посуду, на вогнішчах, вуглях, камянях, якія клалі ў вогнішча, зрэдку запякалі ў гарачай зале. Ведалі аўстралійцы і земляную печ. Для прыгатавання раслінай ежы абарыгены прымянялі зерняцёркі. Прадукцыю збіральніцтва расціралі, размалочвалі, вымочвалі і г.д. перад ужываннем у ежу.

## Сацыяльная структура

Сацыяльная структура абарыгенаў была дастаткова складанай і архаічнай. Шлюб быў парным. Некалькі сямей складалі асноўную адзінку – лакальную групу, якая была і вытворчай адзінкай. Унутры яе не было сацыяльнай дыферэнцыяцыі. Існаваў толькі падзел на полаўзроставыя групы: дарослых мужчын – паляўнічых і групу жанчын і падлеткаў, якія займаліся збіральніцтвам.

Групы аб'ядноўваліся ў плямёны, якія налічвалі ад 100 да 3 тыс. чалавек. Некалькі блізкасваяцкіх плямёнаў зрэдку ўтваралі племянную групу, якая мела ўяўленні аб агульнасці паходжання. Племя збіралася разам 1–2 разы на год. Звычайна яно дзялілася на 2 экзагамныя групы – **фратрыі**, унутры якіх забараняліся шлюбы. **Экзагамія** – літаральна з грэчаскай мовы "вонкавы шлюб". Фратрыі дзяліліся на роды і на 2 ці 4 шлюбныя класы. Шлюбныя адносіны дазваляліся толькі з пэўнымі шлюбнымі класамі. Роднасць вялася пераважна па бацькоўскай лініі. Гэта складаная арганізацыя абмяжоўвала сексуальнае спаборніцтва ў грамадстве і прадухіляла кровазмяшэнне.

**Палітычная структура** ў аўстралійцаў адсутнічала. Аўстралійскае грамадства – **арцэфальнае** (безгаловае). Не існавала палітычных лідэраў і павадыроў. Усе пытанні вырашаліся на сходах дарослых мужчын, пры гэтым найкаштоўнейшымі лічыліся думкі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

найстарэйшых мужчын. Існавала своеасаблівая форма **герантакратыі**. Сярод старых у лакальнай групе звычайна быў нефармальны лідэр. Але адзіным яго прывілеем была мажлівасць раіць маршрут вандравання ды даваць каштоўныя парады.

Адносіны паміж лакальнымі групамі і плямёнамі насілі пераважна мірны характар. Яны вялі натуральны абмен. Канфлікты, як правіла, не былі дужа вострымі і хутка ўладжваліся.

## Сацыялізацыя ў аўстралійскім грамадстве

Аўстралійцы ведалі, колькі людзей можа пракарміць пэўная тэрыторыя і асэнсавана абмяжоўвалі колькасць насельніцтва (гэтая асаблівасць уласціва практычна ўсім паляўнічым народам). Выкарыстоўвалі кантрацэпцыю, умелі перарываць цяжарнасць. Існаваў у абарыгенаў і **інфацыт** – забойства ўласных дзяцей. Ад незапланаваных дзяцей пазбаўляліся – пакідалі дзе-небудзь без дагляду.

**Традыцыйная сістэма выхавання** выключала фізічныя пакаранні. Запланаваныя дзеці мелі шчаслівае дзяцінства. Яно цягнулася да палавога выспявання, пасля чаго пачынаўся этап падрыхтоўкі да дарослага жыцця, да **ініцыяцыі**. Аўстралійцы фарміравалі групу хлопчыкаў на чале з паляўнічым, які вучыў іх неабходным навыкам. Часам навучанне было індывідуальным, калі хлопца вучыў старэйшы брат будучай жонкі.

Навучанне ўключала курсы мясцовай геаграфіі, тэхналогіі палявання, гісторыі абшчыны, міфалогіі. Хлопчыкаў вучылі прыгожа размаўляць. Кожны хлопчык павінен быў умець складаць казкі. Дзяўчынак у групе навучалі кулінарыі, тэхналогіі збіральніцтва, дагляду за дзецьмі і г.д. Пасля заканчэння курса навучання адбываўся сам абрад ініцыяцыі, падчас якога дэманстравалася яго прафесійная прыгоднасць і выпрабаванне болем. Тыя асобы, якія іх вытрымалі, лічыліся дарослымі і атрымоўвалі права ўступіць у шлюб. Тыя, хто не прайшоў ініцыяцыю, заставаліся ў дзяцінстве. У такім стане можна было пражыць да смерці.

## Рэлігійныя вераванні і духоўная культура

Аўстралія з'яўляецца кантынентам класічнага **татэмізму** – веры ў звышнатуральную роднасць паміж групамі людзей і пэўнай жывёлай, радзей раслінай ці з'явай прыроды. Лічылася, што татэм – расліна, мінерал ці жывёла – з'яўляецца продкам групы людзей. Забаранялася



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

паляваць на гэтую жывёлу і ўжываць у ежу за выключэннем некалькіх дзён у годзе.

Аўстралійцы верылі, што татэмная жывёла можа пераўтварацца ў нябачную істоту, пранікненне якой у цела жанчыны выклікае цяжарнасць. Кожны чалавек з'яўляецца ўвасабленнем татэмнай жывёлы.

У абшчынах існавалі культавыя цэнтры – вялізныя камяні, скалы ці валуны, даліны рэк. У іх праводзіліся абрады памнажэння. Мэта – заклікаць усю прыроду, жывёльны свет размнажацца і забяспечыць аўстралійцаў харчаваннем. У першую чаргу заклікалі рабіць гэта татэмную жывёлу, для чаго выкарыстоўвалі невялікія кавалачкі дрэва, каменьчыкі, якія бралі ў рукі. Лічылася, што так усталёўваўся кантакт з татэмнай жывёлай.

У Аўстраліі былі шырока распаўсюджаны магічныя вераванні. Абарыгены выкарыстоўвалі **магію** – веру ў здольнасці чалавека звышнатуральным чынам уплываць на іншых людзей і прыроду ў вытворчых, медычных ці побытавых мэтах. Магіяй мог займацца кожны чалавек.

Аўстралійцы верылі, што ўсё нядобрае ў чалавека (хваробы, смерць) – вынік магічных дзеянняў з боку варожых людзей – злачыннай магіі. Так, некаторыя плямёны аўстралійцаў лічылі, што размова жанчын перашкаджае паляванню мужчын. Таму жанчыны маўчалі падоўгу, а камунікавалі жэстамі. Да сённяшняга часу ў пасяленнях племені **аруба** сярод жанчын пераважае мова жэстаў. Апроч злачыннай магіі аўстралійцы шырока практыкавалі магію медычную. Яны эфектыўна лячылі пераломы, удары.

## Тасманійская праблема

**Тасманійская праблема** разглядаецца на семінары і вывучаецца самастойна. Пры падрыхтоўцы гэтага пытання трэба разглядаць праблему ў шырокім кантэксце. Часта студэнты звужваюць тасманійскую праблему да праблемы паходжання тасманійцаў і пытання апісання іх антрапалагічнага тыпу. Безумоўна, пытанне засялення вострава цікавае і вельмі спрэчнае. Актуальна і праблема фізічнай антрапалогіі абарыгенаў Тасманіі. Яна выклікае вялікую дыскусію з прычыны знікнення тасманійцаў. Але з гэтай жа прычыны вымірання, а таксама з-за этнаграфічнай недаследаванасці вынікаюць спрэчныя і ўсе іншыя аспекты культуры тасманійцаў, у тым ліку



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ступень развіцця іх культуры. Некаторыя даследчыкі схільныя бачыць у тасманійцах апошніх прадстаўнікоў эпохі палеаліту, якіх сустракаў сучасны чалавек, што робіць даследаванні іх культуры надзвычай цікавымі. Магчыма яшчэ ў XIX ст. цывілізаваны чалавек, нібыта на машыне часу, мог вярнуцца на гэтым востраве на дзесяткі тысячагоддзяў назад, паглядзець на сябе ў перыяд юнацтва чалавецтва. Але фактычна еўрапейскія каланісты ўпусцілі магчымасць вывучэння той старажытнай эпохі. Сёння вучоныя спрабуюць выявіць характэрныя рысы гаспадаркі і матэрыяльнай культуры, правесці гістарычную рэканструкцыю сацыяльнага ладу тасманійцаў. Але ўсе гіпотэзы выклікаюць вострыя дыскусіі з-за недахопу этналагічнага матэрыялу.

## Сучасныя этнічныя працэсы

Сёння ўсе лепшыя прыдатныя для земляробства землі Аўстраліі засяляюць англааўстралійцы: перасяленцы пераважна з Вялікабрытаніі, пазней з іншых краін Еўропы, а сёння і з Азіі. Да гэтага часу захоўваюцца культурныя адрозненні паміж выхадцамі з Англіі, Шатландыі і Ірландыі, перш-наперш дзякуючы іх рознай канфесійнай прыналежнасці. Нашчадкі англічан – пераважна англікане, часткова метадысты, шатландцаў – кальвіністы, ірландцаў – каталікі. Большасць англааўстралійцаў (90%) жывуць у індывідуальных дамах гарадоў і гарадскіх мегаполісаў. Аўстралійцы надзвычай дэмакратычныя ў адзенні і побыце.

Распрацоўка зямель перасяленцаў прывяла да змяншэння арэала рассялення абарыгенаў. Абарыгены сёння жывуць у пустынях Заходняй і Цэнтральнай Аўстраліі, трапічных лясах поўначы краіны. Высечка лясоў, арашэнне прывяло да засалення глебы і вады (соль тут засталася ў глебе з часоў, калі Аўстралія была дном акіяна). Ужо сёння некаторыя раёны Заходняй Аўстраліі нагадваюць марсіянскія пейзажы. Шкілеты дрэў з агаленымі каранямі тарчаць з салёнай стаячай вады, якая пакрыта самымі неверагоднымі крышталямі солі.

Два дзесяцігоддзі аўстралійцы пры дапамозе грамадскіх арганізацый змагаюцца супраць распрацоўкі ўранавых руд на поўначы Аўстраліі побач з сусветна вядомым нацыянальным паркам “Какаду”, які прызнаны набыткам усяго чалавецтва. Аўстралія зможа выйсці ў лідэры па здабычы ўрану, але Нацыянальнаму парку і абарыгенам гэта, відаць, не прынясе нічога добрага.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да 1970-х гг. праводзілася палітыка асіміляцыі карэннага насельніцтва. Абарыгенам заканадаўча забаранялася размаўляць на родных мовах. Цяпер з 200–600 моў засталося каля 25 моў карэннага насельніцтва Аўстраліі. Толькі пасля гэтага палітыка змянілася, урад сёння імкнецца адраджаць традыцыйную культуру абарыгенаў. Ім выдзяляюць істотную матэрыяльную, у тым ліку фінансавую, дапамогу. Урад і фонды фінансуюць праграмы этнічнага адраджэння.

Доўгі час былі абмежаваны грамадзянскія і палітычныя правы абарыгенаў. Яны не ўдзельнічалі ў выбарах у парламент і муніцыпалітэты. З 1970-х гг. сітуацыя змянілася, інтарэсы карэнных жыхароў у парламенце Аўстралійскага саюза абараняў іх прадстаўнік Невелі Браун, якога пазней замяніў Адэн Рыджуэй. Ён шэсць гадоў прадстаўляў інтарэсы цёмнаскурых жыхароў краіны, але прайграў наступныя выбары 2004 г. Гэта адбылося адначасова з рашэннем прэм'ер-міністра аб роспуску "з-за неэфектыўнасці работы" Камісіі па справах абарыгенаў і жыхароў астравоў праліва Тарэса. Праблемы захавання этнічнай самаідэнтычнасці і традыцыйнай культуры абарыгенаў застаюцца актуальнымі і вострымі і ў XXI ст.

**Пытанні для самакантролю:**

- Якія геаграфічныя асаблівасці кантынента вызначалі ўмовы жыцця абарыгенаў Аўстраліі?
- У гонар каго называлася найвышэйшая кропка Аўстраліі?
- Калі з'явіліся на кантыненце першыя людзі і як праходзіла яго засяленне?
- Да якога расавага тыпу адносяцца абарыгены Аўстраліі?
- Чаму ў літаратуры сустракаюцца розныя лічбы моўных сямей і моў карэннага насельніцтва Аўстраліі?
- На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця па археалагічнай класіфікацыі знаходзіліся абарыгены Аўстраліі? Абгрунтуйце свой адказ.
- Якія прылады палявання ведалі толькі абарыгены Аўстраліі, якіх агульнавядомых прылад яны не ведалі?
- Для чаго племя дзялілася на экзагамныя групы?
- Чаму традыцыйнае аўстралійскае грамадства можна назваць арцэфальным?
- Што такое інфацыт? Чаму ён існаваў у аўстралійцаў?



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

- Якія асаблівасці традыцыйных вераванняў вылучаюць аўстралійцаў?
- Чаму жанчыны племені аруба размаўляюць пераважана з дапамогай мовы жэстаў?
- Які змест укладаюць вучоныя ў вызначэнне "тасманійская праблема"?
- З якімі экалагічнымі праблемамі сутыкаюцца абарыгены Аўстраліі?
- Якія змены ў палітыцы Аўстраліі ў дачыненні да карэннага насельніцтва краіны адбыліся ў XX ст.?

## ПАПУАСЫ НОВАЙ ГВІНЕІ

### Геаграфічная характарыстыка

Новая Гвінея – адзін з самых вялізных астравоў у свеце. Яго плошча складае каля 800 тыс. км$^2$ і саступае толькі Грэнландыі. Клімат экватарыяльны. Насельніцтва складае каля 5 млн чалавек. Большасць насельніцтва вострава (каля 90%) складаюць папуаскія народы.

Этнолагі пачалі даследаваць востраў параўнальна позна, чаму спрыяла геаграфія вострава. Па краях Новай Гвінеі знаходзяцца высокія горы, ці непраходная дрыгва балот, а большасць насельніцтва жыве ва ўнутраных частках вострава. У многія раёны Новай Гвінеі першыя еўрапейцы трапілі толькі ў першай палове XX ст. Усё гэта зрабіла Новую Гвінею своеасаблівым запаведнікам для этнолагаў. У XIX ст. (1870 – 1880-я гг.) М.М. Міклуха-Маклай даследаваў Новую Гвінею.

### Антрапалагічная характарыстыка

**Антрапалагічна** большасць насельніцтва Новай Гвінеі адносіцца да папуаскага расавага тыпу. Продкі сучасных папуасаў засялілі востраў каля 30 тыс. гадоў назад. Ім уласціва цёмная скура, кучаравыя валасы, тоўстыя губы і шырокі нос. Сваім больш вузкім тварам і своеасаблівым кручкавідным (ілжэсемітычным) носам папуасы адрозніваюцца ад дужа падобных на іх меланезійцаў. Частка жыхароў вострава адносяцца да меланезійскай малой расы, якая пасялілася ў некаторых прыбярэжных раёнах каля 5 тыс. гадоў назад.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Лінгвістычная сітуацыя

Папуаскія мовы вельмі разнастайныя і не адносяцца да адной генетычнай групы. Самая вялікая з іх – трансновагвінейская моўная сям'я, на якой размаўляюць каля 85% папуасаў. У многіх раёнах Новай Гвінеі распаўсюджана цікавая лінгвістычная з'ява – **этналінгвістычная непарыўнасць**: не існуе дакладных межаў паміж рознымі мовамі, якіх налічваюць да 700. Большасць этнасаў колькасна вельмі невялікая і налічвае да некалькіх тысяч чалавек.

## Гаспадарка і матэрыяльная культура

Традыцыйна папуасы займаліся ручным земляробствам. Шырока практыкавалася лядна-агнявая сістэма земляробства. Папуасы расчышчалі джунглі, спальвалі дрэвы і некалькі гадоў засявалі поле. Потым яго закідвалі і яно зарастала. Мужчыны рыхтавалі і ўскопвалі ўчастак зямлі, а жанчыны і дзеці драбілі зямлю, садзілі, даглядалі і збіралі ўраджай. Адзінымі прыладамі працы з'яўляліся каменная сякера, завостраны кол і зрэдку матыка. Яшчэ зусім нядаўна ўсе прылады працы выраблялiся з каменю, касцей, дрэва і ракавін.

Асноўныя сельскагаспадарчыя культуры: караняплоды ямс, таро і батат, какосавая пальма, бананы, хлебнае дрэва. Сёння таксама вырошчваюць бульбу, бабы. Карміла папуасаў таксама сагавая і арэхавая пальмы. Шаўкоўнічнае дрэва, адмочаную і адбітую кару якога пераўтваралі ў эластычны матэрыял – **тапу**, давала адзенне.

Папуасы займаліся і жывёлагадоўляй: вырошчвалі свіней, курэй, сабак. Рыбалоўства было слаба развіта.

**Паселішчы** – як правіла, невялікія вёскі, колькасць жыхароў якіх не перавышала 100-150 чалавек. Пражывалі папуасы ў квадратных, радзей круглых дамах, на палях вышынёй 1–2 метра або земляных. У пакоях не было мэблі. Спалі на падлозе на плеценых цыноўках.

**Адзенне** выраблялі з **тапы**, якую мужчыны некалькі разоў абгортвалі вакол бёдраў і прапускалі паміж ног, а жанчыны з яе або раслін майстравалі спадніцы.

Папуасы любілі і любяць упрыгожваць цела татуіроўкамі і афарбоўкай. У дарослых часцяком ёю пакрыта ўсё цела, нават твары. Жанчыны татуіравалі і вусны. Упрыгожванні – бранзалеты, завушніцы, насавыя ўстаўкі і г.д. – носяць пераважна мужчыны.

**Кулінарыя** папуасаў мала адрозніваецца ад кухні абарыгенаў Аўстраліі. Ежа пераважна расліннага характару.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

### Сацыяльная структура

Вясковая абшчына колькасцю 150–200 чалавек была асноўнай сацыяльнай і гаспадарчай адзінкай папуасаў. Вынікі грамадскай працы належалі ўсёй абшчыне.У абшчынах існавала моцная канкурэнцыя паміж мужчынамі і жанчынамі. Яна была выклікана тым, што жанчыны адыгрывалі галоўную ролю ў гаспадарчым жыцці, у першую чаргу ў земляробстве. Сацыяльны статус жанчын быў высокім. У кожнай вёсцы быў мужчынскі дом – **дарымо**. Мужчыны збіраліся ў ім і дэманстравалі сваю мужчынскую салідарнасць.

Найбольш распаўсюджана была радавая абшчына. Род у папуасаў быў бацькоўскі, толькі ў меланезійцаў лік сваяцтва вёўся па жаночай лініі. У папуасаў існаваў звычай **кувада** (фр. кудахтаць як курыца). Калі жанчына нараджала, муж клаўся побач і імітаваў родавыя схваткі. Ён дэманстраваў, што гэта дзіця ягонае.

Некалькі родаў знаходзіліся ў пастаянным кантакце, былі звязаны агульнасцю паходжання, агульнай мовай. Яны былі фактычна фратрыяй. Да прыходу еўрапейцаў такія саюзы родаў былі самай буйной сацыяльнай арганізацыяй. Плямёны адсутнічалі ці былі дужа аморфнымі. Суседская абшчына распаўсюджана каля гарадоў пад уплывам цывілізацыі.

У грамадстве не было палітычных лідэраў, племянных павадыроў і г.д. Але існавала сацыяльная роля **бігмэна** (вялікі мужчына) – фізічна моцнага мужчыны, які карыстаецца павагай абшчыны. Ён арганізоўваў бяседы і запрашаў на іх усіх аднавяскоўцаў.

Інстытут **бігмэнства** звязаны са з'явай прэстыжнай эканомікі – вытворчасці, накіраванай на адорванне суседзяў, а не на ўласнае спажыванне. Бігмэн меў некалькі жонак, нярэдка яны жылі ў розных вёсках. Сэнс мнагажонства складаўся ў тым, што большая колькасць жонак магла выгадаваць больш кабаноў, што давала магчымасць пачаставаць больш родзічаў і карыстацца большай павагай.

Бігмэн не меў магчымасці загадаць ці прымусіць каго-небудзь выканаць загады. Нават за спробы прымуса яго маглі пакараць смерцю. Пасада бігмэна не перадавалася ў спадчыну. Аўтарытэту яны дабіваліся дзякуючы асабістым якасцям.

### Рэлігійныя вераванні і духоўная культура

Рэлігійныя вераванні папуасаў дастаткова разнастайныя. Як і аўстралійцам, многім групам папуасаў уласцівы татэмізм. Шырока распаўсюджаны і магічныя вераванні.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Але тут склаўся і развіты **культ продкаў**. Папуасы верылі, што пасля смерці памерлыя продкі дапамагаюць сваёй сям'і. На базе гэтых уяўленняў склаўся **культ чарапоў**. Чэрап продка маглі браць з сабой для ўдачы ў дарогу. Своеасаблівы традыцыйны пахавальны абрад. Цела нябожчыка хавалі ў зямлю, а галаву адразалі і насаджвалі на зрубленае дрэва.

Сёння 44% вернікаў – пратэстанты, 22% – каталікі, а 34% па-ранейшаму з'яўляюцца прыхільнікамі мясцовых рэлігійных культаў.

**Фальклор** папуасаў цесна звязаны з вераваннямі. Зафіксавана багата татэмічных міфаў, казак аб духах.

Эталон **прыгажосці** некаторых этнасаў папуасаў вельмі спецыфічны і нязвыклы для еўрапейцаў. Вяршыня прыгажосці ў некаторых этнасаў – выцягнутыя, доўгія грудзі. У інданезійскай частцы вострава жыве племя, у якога прыгажунямі лічацца жанчыны, якія маюць якую небудзь народжаную выродлівасць, напрыклад, вывіх тазасцегнавага сустава. Гэта яшчэ раз паказвае, што прыгажосць і выродлівасць – адносныя паняцці.

## Сучасныя этнічныя працэсы

Нягледзячы на значны прагрэс у многіх галінах народнай гаспадаркі ў апошнія дзесяцігоддзі, у некаторых раёнах вострава лядна-агнявую сістэму земляробства прымяняюць і сёння. Па-ранейшаму пераважае натуральная і паўнатуральная сельская гаспадарка і традыцыйны ўклад жыцця ў вясковых раёнах.

Да гэтага часу ў аддаленых раёнах Папуа – Новай Гвінеі разам з "кінай" – валютай краіны ходзяць як грашовыя знакі ракавінкі. Прычым яны абясцэньваюцца павольней, чым інфляцыя кіны. Есць нават банк, уладальнікі якога лічаць, што звязкі ракавінак лепшая манета, і выкарыстоўваюць яе як рэзервовую валюту.

**Пытанні для самакантролю:**

- Чаму некаторыя вучоныя называюць Новую Гвінею этналагічным запаведнікам?
- Які расійскі вучоны стаў знакамітым даследчыкам папуасаў?
- Да якіх расавых тыпаў адносіцца насельніцтва Новай Гвінеі?
- Што такое этналінгвістычная непарыўнасць?
- На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця знаходзіліся папуасы?



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

- Якія сельскагаспадарчыя культуры вырошчвалі папуасы?
- Як і з чаго рабілася тапа?
- Як называліся і для чаго ў вёсках існавалі мужчынскія дамы?
- Якія, на ваш погляд, прычыны ўзнікнення звычаю кувада?
- Якую ролю ў папуасаў адыгрывалі бігмэны?
- Што агульнага і ў чым розніца традыцыйных рэлігійных вераванняў аўстралійцаў і папуасаў?
- У чым спецыфіка і нязвыкласць для еўрапейцаў эталона прыгажосці некаторых папуаскіх народаў?
- Для якіх мэтаў да гэтага часу выкарыстоўваюць ракавінкі ў Новай Гвінеі?

## ЭТНІЧНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ МЕЛАНЕЗІІ

### Геаграфічная характарыстыка

Меланезія – краіна чорных (грэцкае melas – чорны) астравоў. Гэтая астраўная група па поўнач і паўднёвы усход ад Аўстраліі працягнулася ад экватара да тропіка Казярога на 5 тыс. км. У геаграфічным сэнсе яна ўключае і Новую Гвінею, а ў больш вузкім, якім мы і будзем карыстацца, – такія астраўныя групы, як архіпелаг Бісмарка, Саламонавы астравы, Новыя Гебрыды, Новая Каледонія і г.д. Клімат экватарыяльны і трапічны.

### Антрапалагічная і лінгвістычная характарыстыка

Антрапалагічна меланезійцы адносяцца да малой меланезійскай расы (або тыпа), пражываюць на астравах і папуасы.

У Меланезіі налічваецца да 200 генетычна вельмі разнастайных этнасаў, якія размаўляюць пераважна на аўстранезійскіх і папуаскіх мовах. Аўстранезійская моўная сям'я ўключае інданезійскую, палінезійскую, меланезійскую і мікранезійскую групы, апошнія тры часам аб'ядноўваюць у акіянскія мовы. Колькасна меланезійскія этнасы невялікія, звычайна ад некалькі соцень да некалькі тысяч чалавек.

Антрапалагічная і лінгвістычная сітуацыя нагадвае новагвінейскую. Толькі ў Меланезіі ўжо папуаскія народы складаюць невялікую меншасць, а меланезійцы пераважную большасць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Гаспадарка і матэрыяльная культура

Апрача адзінага антрапалагічнага тыпу, Меланезію аб'ядноўвае і прыналежнасць большасці насельніцтва да гаспадарча-культурнага тыпу ручных земляробаў трапічных лясоў. Гаспадарка большай часткі Меланезіі падобная на папуаскую. Аснова яе – лядна-агнявое земляробства, якое тэхналагічна нагадвае папуаскае. Але ў Новай Каледоніі прымянялася і штучнае арашэнне. Практычна земляробствам займаліся толькі жанчыны. Меланезійцы вырошчваюць тыя ж асноўныя сельскагаспадарчыя культуры, што і папуасы. Какосавая пальма ў апошнія дзесяцігоддзі стала галоўнай таварнай культурай.

Мясцовае насельніцтва да кантактаў з еўрапейцамі разводзіла свіней, курэй, сабак, якіх таксама ўжывалі ў ежу. Еўрапейцы завязлі на астравы буйную рагатую жывёлу, коз, авечак.

У гаспадарчым жыцці найбольш істотнае адрозненне папуасаў ад меланезійцаў – гэта значнае развіццё марскога рыбалоўства. Меланезійцы зрабілі вынаходніцтва катамаранаў (падвоеных лодак) і лодак з балансірамі, што дазваляла лавіць рыбу ў небяспечных умовах Ціхага акіяна. Яны выкарыстоўвалі практычна ўсе вядомыя ў свеце прылады працы для рыбнай лоўлі: кручкі, сетку, пасткі, раслінную атруту, марское паляванне на акулу астрогамі, лукам і стрэламі. Рыбалоўства – традыцыйна выключна мужчынскі занятак.

У адрозненні ад папуасаў у меланезійцаў рамёствы пачалі аддзяляцца ў асобны від дзейнасці, у тым ліку керамічнае. Добра было развіта пляценне з раслінных валокнаў цыновак, сумак, кошыкаў. Ткацтва большасць народаў не ведала. Ганчарствам займаліся толькі жанчыны.

У Меланезіі быў шырока распаўсюджаны абмен таварамі. У якасці эквіваленту, як і ў Новай Гвінеі, часта выкарыстоўвалі адпаліраваныя ракавіны.

Меланезійцы да сустрэчы з еўрапейцамі таксама , як папуасы і абарыгены Аўстраліі, не ведалі металу. Галоўная прылада працы – адпаліраваная каменная сякера. З баявой зброі меланезійцы ведалі лук і стрэлы, дзіды, кінжалы, баявыя сякеры, але найбольш былі распаўсюджаны кідальныя паліцы.

**Харчаванне** падобнае на аўстралійскае і папуаскае. Свініну ўжываюць рэдка, але тут шмат ядуць рыбы, якую любяць запякаць ў земляных печках.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Адзенне** з тапы, лістоўя і травы было мінімальным, а на некаторых астравах зусім адсутнічала. Меланезійцы, асабліва мужчыны, насілі шмат упрыгожванняў: татуіроўкі, бранзалеты, завушніцы і г.д.

**Паселішчы** падобныя на папуаскія, але дамы ў меланезійцаў у большасці квадратныя ў плане з двухскатнай страхой.

## Сацыяльная і палітычная структуры

Племянная структура ў меланезійцаў практычна не склалася (у навуковай літаратуры вядзецца працяглая спрэчка аб наяўнасці ў меланезійцаў плямён), а вось тыповая вясковая абшчына шырока распаўсюджана. Толькі на Новай Каледоніі, бясспрэчна, існавалі плямёны.

Жонка сялілася ў абшчыне мужа, але род вёўся па мацярынскай лініі. Мацярынскі род меланезійцаў не трэба блытаць з матрыярхатам. Строга выконваліся традыцыі экзагаміі. Існавала вострая канкурэнцыя паміж мужчынамі і жанчынамі. Значную ролю ў сацыяльным і рэлігійным жыцці меланезійцаў адыгрывалі таемныя **мужчынскія саюзы**. Мужчыны некалькі разоў на год збіраліся ў лесе, выраблялі жудасныя маскі, фарбавалі цела і, пасярод ночы арганізоўвалі рытуальныя напады на вёскі. Мэта – мацней напалохаць жанчын і такім чынам прадэманстраваць сваю мужчынскую годнасць. На шэрагу астравоў, напрыклад на Новай Каледоніі, мацярынскі род змяніўся на бацькоўскі.

Зямля з'яўлялася вясковай уласнасцю, але апрацоўвалася сем'ямі асобна. Назіралася маёмасная і сацыяльная дыферэнцыяцыя. У адрозненні ад Новай Гвінеі тут былі палітычныя лідэры – павадыры, улада іх пашыралася на некалькі абшчын.

Па ўзроўні грамадскага развіцця меланезійцы стаялі на стадыі разлажэння радавога ладу, прыкметна апераджалі папуасаў, але саступалі палінезійцам.

## Рэлігійныя вераванні і духоўная культура

У меланезійцаў шырока распаўсюджана ўяўленне аб звышнатуральнай сіле **мана**. Мана разліта па ўсёй прыродзе, уласціва прадметам, людзям, духам памерлых людзей. Распаўсюджаны былі таксама анімістычныя і магічныя вераванні, культ продкаў.

Склаліся ў меланезійцаў і **прамысловыя культы**. Падобная з'ява заўсёды адбываецца, калі гаспадарчая дзейнасць носіць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рызыкоўны характар, пры паляванні на акулу, напрыклад. У сувязі са з'яўленнем культаў назіралася прафесіяналізацыя рэлігійнага жыцця. Узніклі асобы – **шаманы** (тунгускае слова), якія лічыліся спецыялістамі па сувязі са звышнатуральным светам. Шаманы атрымоўвалі натуральную аплату за рэлігійныя паслугі, але гэтага было недастаткова, каб існаваць цалкам за яе кошт. Таму яны займаліся і гаспадарчай дзейнасцю.

У XX ст. у рэлігійным жыцці адбыліся істотныя змены. Прыйшлі хрысціянскія місіянеры. На вачах вучоных узнік **культ карга** (англ. *груз.*) Хрысціянскія місіянеры не здолелі пераўтварыць меланезійцаў ў хрысціян. Разам з тым у тутэйшага насельніцтва склалася ўяўленне аб нейкім адзіным Богу.

Падчас другой сусветнай вайны амерыканцы будавалі ў Меланезіі вайсковыя базы. На будаўніцтва запрашалі меланезійцаў і плацілі ім болей, чым раней англічане. Пасля заканчэння вайны амерыканцы пакінулі вялікую колькасць вайсковага рыштунку: лапаты, сякеры, адзенне. Усё гэта меланезійцы называлі "карга" – груз. У іх склалася ўяўленне, што вярхоўны Бог валодае "карга" і раздае яго ўсім людзям.

Яны 20 год чакалі сваю частку "карга". Назіральнікі сачылі за самалётам, плялі мадэлі караблёў, якім неслі ахвяры для паскарэння паступлення "карга". Так на вачах вучоных складаўся рэлігійны культ.

У меланезійцаў развіты міфалагічны эпас, прыкладное мастацтва, у тым ліку разьба па дрэве. Разьбяры выраблялі знакамітыя ў свеце маскі і нагалоўі. Стылізаваны арнамент наносіўся на прадметы хатняга начыння, зброю і г.д. Яны ведалі як прымітыўныя ўдарныя, так і духавыя інструменты. Музыка суправаджалася танцамі, падчас якіх імітаваліся працоўныя аперацыі, баявыя дзеянні і г.д.

Народы Фіджы, як у антрапалагічным, так і ў культурным плане займаюць прамежкавае становішча паміж Меланезійцамі і Палінезійцамі.

**Пытанні для самакантролю:**

- Якія астравы ўваходзяць у склад Меланезіі?
- Да якіх расавых тыпаў адносіцца насельніцтва Меланезіі?
- Якія групы ўваходзяць у аўстранезійскую моўную сям'ю?
- На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця знаходзіліся меланезійцы да прыходу еўрапейцаў?



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

- Чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі меланезійцаў і папуасаў?
- Для каго перш-наперш выраблялiся ўпрыгожванні на астравах Меланезii?
- Па якой лiнii вялася роднасць у меланезійцаў?
- Якую ролю адыгрывалі таемныя мужчынскія саюзы ў жыцці меланезійцаў?
- Што агульнага і чым адрозніваюцца традыцыйныя рэлігійныя вераванні меланезійцаў і папуасаў?
- Як склаўся культ "карга"?

## ЭТНІЧНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ ПАЛІНЕЗІІ

### Геаграфічная характарыстыка

Палінезія – адна з асноўных астраўных груп у цэнтры Ціхага акіяна паміж Гавайскімі астравамі на поўначы, Новай Зеландыяй на поўдні і востравам Вялікадня – Пасхі на ўсходзе. Клімат экватарыяльны і трапічны. Вялізная колькасць астравоў раскідана на аграмаднай тэрыторыі акіяна. Але плошча сушы складае толькі 26 тыс. км$^2$ пры насельніцтве меней за 2 млн чалавек. (Для параўнання: тэрыторыя Магілёўскай вобласці – 29 тыс. км$^2$, а насельніцтва – 1240 тыс. чалавек). У Палінезіі пражывае каля 40 этнасаў.

### Антрапалагічная і лінгвістычная характарыстыка

Нягледзячы на вялікую тэрыторыю і аддаленасць астравоў Палінезіі, палінезійцы блізкія антрапалагічна, моўна і культурна. Яны належаць да малой палінезійскай расы, якая з'яўляецца пераходнай паміж экватарыяльнай і мангалоіднай. Для іх уласціва смуглая скура, высокі рост, сярэдневыступаючы шырокі нос, сярэдняя ступень развіцця трацічнага валасянога покрыва.

Антрапалагічны тып палінезійцаў склаўся ў выніку змяшэння старажытных паўднёвых мангалоідаў і неграў-аўстралоідаў. Т. Хейердал адстойваў тэорыю амерыканскага паходжання палінезійцаў, але большасць даследчыкаў лічыць, што продкамі палінезійцаў былі групы мараходаў, якія з Паўднёва-Усходняй Азіі праніклі праз Меланезію і Мікранезію на заходнія Палінезійскія астравы. Тут ва ўмовах поўнай ізаляцыі завяршылася фарміраванне антрапалагічнага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тыпа палінезійцаў і асноўных асаблівасцей культуры. Засяленне шматлікіх астравоў Палінезіі пачалося з сярэдзіны першага тыс. да н. э. і расцягнулася амаль на 2 тысячагоддзі.

Палінезійскія мовы падобныя на мовы меланезійцаў. Яны адносяцца да ўсходнеакіянічнай групы аўстранезійскай моўнай сям'і. Іх налічваюць тры дзесяткі, меней, чым народаў, бо некаторыя этнасы размаўляюць на дыялектах адной мовы.

## Гаспадарка і матэрыяльная культура

Гаспадарка палінезійцаў адносіцца да астраўнога, ці акіянічнага, тыпу. Яна падобная на гаспадарку меланезійцаў, толькі рыбалоўства адыгрывае яшчэ большую ролю, а паляванне – яшчэ меншую. У адрозненні ад Меланезіі ў Палінезіі земляробствам займаліся і мужчыны, і жанчыны.

Сапраўдных вышынь палінезійцы дасягнулі ў мараходстве і рыбалоўстве. Яны выдатна арыентаваліся па зорках, адрознівалі планеты, мелі ўяўленні аб суседніх архіпелагах, нават складалі прымітыўныя карты. Усё гэта дазваляла ім здзяйсняць дальнія марскія падарожжы і перасяленні.

Рамяство тут ужо вылучылася ў самастойны від заняткаў. Было добра развіта пляценне. Металу палінезійцы не ведалі. Ткацтва і керамічная вытворчасць, апошняя з-за адсутнасці гліны, былі не развіты, на некаторых астравах забыты.

**Паселішчы.** Кожная сям'я жыве ў асобных будынках слупавай канструкцыі, квадратных ці авальных у плане.

**Харчаванне і адзенне** падобнае на меланезійскае. Апошняе выраблялася з тапы, лістоўя, травы, цыновак і было мінімальным: набедраныя павязкі або фартухі ў мужчын, спаднічкі ў жанчын. Як і іншыя жыхары Акіяніі, мужчыны і жанчыны любяць упрыгожванні, часта ўпрыгожваюцца кветкамі.

## Сацыяльная структура і палітычнае жыццё

Асноўнай сацыяльнай і гаспадарчай адзінкай у палінезійцаў была вялікая патрыярхальная сям'я. Некалькі вялікіх сямей адной вёскі аб'ядноўваліся ў тэрытарыяльную абшчыну, на савеце якой вырашалі мясцовыя праблемы. Рашаючы ўплыў на рашэнні прымаў галава сям'і. А вось родавая арганізацыя не зафіксавана.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Формы ўласнасці былі разнастайнымі. Рухомая маёмасць знаходзілася ў прыватнай уласнасці. Зямля лічылася вясковай або сямейнай уласнасцю. Назіралася моцная маёмасная і сацыяльная дыферэнцыяцыя насельніцтва.

У палінезійцаў склаўся **саслоўна-каставы** грамадскі лад. Галоўную ролю ў грамадстве адыгрывалі павадыры, якія мелі абсалютную ўладу. Павадыр вырашаў спрэчкі, набіраў мужчын у войска, арганізоўваў грамадскія работы, збіраў даніну і звычайна ён жа быў галоўным святаром.

З павадырамі амаль на ўсіх астравах была цесна звязана мясцовая эліта – знатныя палінезійцы. Знаць дзялілася на рангі. Яна была звязана сваяцкімі сувязямі паміж сабой. Ёй належалі лепшыя землі. Ніжэй знаходзілася каста свабодных абшчыннікаў, а яшчэ ніжэй рабоў.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у гавайцаў, таіцян і тонга пачаліся складвацца раннекласавыя дзяржавы.

## Рэлігійныя вераванні і духоўная культура

Павадырства звязана з уяўленнем аб **"мана"** і ўяўленнямі аб **"табу".** Палінезійцы, як і меланезійцы, верылі ў звышнатуральную сілу **"мана".** Пры гэтым яны лічылі, што асобныя людзі маюць здольнасць канцэнтраваць "мана" ў сваім целе. Той, хто дабіўся поспеху ў жыцці, той мае большую колькасць "мана". Павадыры мелі, па ўяўленнях меланезійцаў, шмат "мана", якую яны здольныя перадаваць у спадчыну. З гэтымі вераваннямі была звязана спадчынная ўлада павадыроў. **"Табу"** (палінезійскае слова забарона) увайшло ва ўсе еўрапейскія мовы. "Табу" звязана з асобаю павадыра. Простыя людзі не маглі заходзіць у жыллё павадыра, кранаць адзенне, есці яго ежу.

З павадырствам звязаны рэлігійныя ўяўленні аб звышнатуральнай моцнай сіле продкаў павадыра. Пры пахаванні павадыра праводзіліся нават чалавечыя ахвярапрынашэнні. Такія ж ахвярапрынашэнні праводзіліся і пры памінанні продкаў павадыра. Для ахвяр выбіралі ваеннапалонных і рабоў.

У палінезійцаў склаўся пантэон Багоў, якія былі падобныя на людзей. Культавыя дзеянні адпраўлялі прафесійныя жрацы – шаманы, якія мелі вялікі аўтарытэт.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Фальклор палінезійцаў багаты, развіты. Зберагаліся гістарычныя паданні, генеалагічныя веды не толькі павадыроў, але і прадстаўнікоў ніжэйшых каст.

Развіта разьба не толькі па дрэве, але і па камені. На востраве Вялікадня жыхары вычэсвалі вялізныя каменныя статуі. На гэтым жа востраве захаваліся нерасшыфраваныя пісьмовыя тэксты ронга-ронга.

**Пытанні для самакантролю:**

- Якія астравы ўваходзяць у склад Палінезіі?
- Да якога расавага тыпу адносіцца насельніцтва Палінезіі?
- У якую групу і моўную сям'ю ўваходзяць палінезійскія мовы?
- На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця знаходзіліся палінезійцы да прыходу еўрапейцаў?
- У чым супадалі і чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі меланезійцаў і палінезійцаў?
- Якія касты існавалі ў палінезійцаў?
- Як звязана вера ў сілу "мана" і ўзмацненне ўлады павадыроў?
- Што агульнага і чым адрозніваюцца традыцыйныя рэлігійныя вераванні меланезійцаў і палінезійцаў?
- Што такое "табу"?
- Дакажыце, што культура палінезійцаў знаходзілася на больш высокім узроўні развіцця, чым меланезійцаў.

## ЭТНІЧНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ МІКРАНЕЗІІ

**Геаграфічная характарыстыка рэгіёна.** Мікранезія – вялікая астраўная група ў заходняй частцы Ціхага акіяна. Клімат экватарыяльны і субэкватарыяльны, расліннасць бедная. Яна ўключае Марыянскія, Каралінскія, Маршалавы і іншыя астравы, якія пераважна з'яўляюцца атоламі. 1500 астравоў займаюць плошчу 2,6 тыс. км$^2$, на якой пражывае каля 500 тыс. чалавек. (Для параўнання: тэрыторыя Шклоўскага і Горацкага раёнаў Магілёўскай вобласці складае 2,8 тыс. км$^2$, а насельніцтва – 64 тыс. чалавек)

Заходняя і Усходняя Мікранезія даволі моцна адрозніваюцца ў антрапалагічных, лінгвістычных і гаспадарчых адносінах.

**Антрапалагічна** карэннае насельніцтва (мікранезійцы) адносіцца да смешаных расавых тыпаў. У Заходняй Мікранезіі назіраецца спалучэнне акіянічных народаў з паўднёва-азіяцкім тыпам, а ва



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Формы ўласнасці былі разнастайнымі. Рухомая маёмасць знаходзілася ў прыватнай уласнасці. Зямля лічылася вясковай або сямейнай уласнасцю.Назіралася моцная маёмасная і сацыяльная дыферэнцыяцыя насельніцтва.

У палінезійцаў склаўся **саслоўна-каставы** грамадскі лад. Галоўную ролю ў грамадстве адыгрывалі павадыры, якія мелі абсалютную ўладу. Павадыр вырашаў спрэчкі, набіраў мужчын у войска, арганізоўваў грамадскія работы, збіраў даніну і звычайна ён жа быў галоўным святаром.

З павадырамі амаль на ўсіх астравах была цесна звязана мясцовая эліта – знатныя палінезійцы. Знаць дзялілася на рангі. Яна была звязана сваяцкімі сувязямі паміж сабой. Ёй належалі лепшыя землі. Ніжэй знаходзілася каста свабодных абшчыннікаў, а яшчэ ніжэй рабоў.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у гавайцаў, таіцян і тонга пачаліся складвацца раннекласавыя дзяржавы.

## Рэлігійныя вераванні і духоўная культура

Павадырства звязана з уяўленнем аб **"мана"** і ўяўленнямі аб **"табу".** Палінезійцы, як і меланезійцы, верылі ў звышнатуральную сілу **"мана"**. Пры гэтым яны лічылі, што асобныя людзі маюць здольнасць канцэнтраваць "мана" ў сваім целе. Той, хто дабіўся поспеху ў жыцці, той мае большую колькасць "мана". Павадыры мелі, па ўяўленнях меланезійцаў, шмат "мана", якую яны здольныя перадаваць у спадчыну. З гэтымі вераваннямі была звязана спадчынная ўлада павадыроў. **"Табу"** (палінезійскае слова забарона) увайшло ва ўсе еўрапейскія мовы. "Табу" звязана з асобаю павадыра. Простыя людзі не маглі заходзіць у жыллё павадыра, кранаць адзенне, есці яго ежу.

З павадырствам звязаны рэлігійныя ўяўленні аб звышнатуральнай моцнай сіле продкаў павадыра. Пры пахаванні павадыра праводзіліся нават чалавечыя ахвярапрынашэнні. Такія ж ахвярапрынашэнні праводзіліся і пры памінанні продкаў павадыра. Для ахвяр выбіралі ваеннапалонных і рабоў.

У палінезійцаў склаўся пантэон Багоў, якія былі падобныя на людзей. Культавыя дзеянні адпраўлялі прафесійныя жрацы – шаманы, якія мелі вялікі аўтарытэт.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Фальклор палінезійцаў багаты, развіты. Зберагаліся гістарычныя паданні, генеалагічныя веды не толькі павадыроў, але і прадстаўнікоў ніжэйшых каст.

Развіта разьба не толькі па дрэве, але і па камені. На востраве Вялікадня жыхары вычэсвалі вялізныя каменныя статуі. На гэтым жа востраве захаваліся нерасшыфраваныя пісьмовыя тэксты ронга-ронга.

**Пытанні для самакантролю:**

- Якія астравы ўваходзяць у склад Палінезіі?
- Да якога расавага тыпу адносіцца насельніцтва Палінезіі?
- У якую групу і моўную сям'ю ўваходзяць палінезійскія мовы?
- На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця знаходзіліся палінезійцы да прыходу еўрапейцаў?
- У чым супадалі і чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі меланезійцаў і палінезійцаў?
- Якія касты існавалі ў палінезійцаў?
- Як звязана вера ў сілу "мана" і ўзмацненне ўлады павадыроў?
- Што агульнага і чым адрозніваюцца традыцыйныя рэлігійныя вераванні меланезійцаў і палінезійцаў?
- Што такое "табу"?
- Дакажыце, што культура палінезійцаў знаходзілася на больш высокім узроўні развіцця, чым меланезійцаў.

## ЭТНІЧНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ МІКРАНЕЗІІ

**Геаграфічная характарыстыка рэгіёна.** Мікранезія – вялікая астраўная група ў заходняй частцы Ціхага акіяна. Клімат экватарыяльны і субэкватарыяльны, расліннасць бедная. Яна ўключае Марыянскія, Каралінскія, Маршалавы і іншыя астравы, якія пераважна з'яўляюцца атоламі. 1500 астравоў займаюць плошчу 2,6 тыс. км$^2$, на якой пражывае каля 500 тыс. чалавек. (Для параўнання: тэрыторыя Шклоўскага і Горацкага раёнаў Магілёўскай вобласці складае 2,8 тыс. км$^2$, а насельніцтва – 64 тыс. чалавек)

Заходняя і Усходняя Мікранезія даволі моцна адрозніваюцца ў антрапалагічных, лінгвістычных і гаспадарчых адносінах.

**Антрапалагічна** карэннае насельніцтва (мікранезійцы) адносіцца да змешаных расавых тыпаў. У Заходняй Мікранезіі назіраецца спалучэнне акіянічных народаў з паўднёва-азіяцкім тыпам, а ва



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўсходняй – меланезійскага і палінезійскага тыпаў. Сучасныя мікранезійцы моцна метысаваныя.

**Лінгвістычная сітуацыя**. У Мікранезіі пражывае толькі паўтара дзясятка этнасаў. Усе мовы належаць аўстранезійскай моўнай сям'і.

**Гаспадарка** мікранезійцаў адносіцца да акіянічнага тыпу. Земляробства пры гэтым відавочна саступае па значнасці рыбалоўству. У заходняй Мікранезіі яшчэ да прыходу еўрапейцаў ведалі ганчарства, а ва ўсходняй – гарызантальны ткацкі станок. Паміж астравамі вёўся актыўны абмен і гандаль, пры гэтым у якасці грошай выкарыстоўвалі ракавінкі і нават камяні.

**Жыллё і паселішчы** тыповыя для акіянічных народаў, але на некаторых астравах яго будавалі на каменным падмурку або нават на каменных слупах і палях. **Кулінарыя і адзенне** мікранезійцаў таксама мала адрозніваліся.

**Сацыяльная структура**. Па ўзроўні грамадскага развіцця мікранезійцы стаялі на стадыі разлажэння радавога ладу. Як і ў палінезійцаў, тут склаўся **саслоўна-каставы** лад грамадства. На некаторых астравах прадстаўнікі розных сацыяльных груп не маглі нават разам есці. Насельніцтва некаторых астравоў выплачвала даніну сваім суседзям.

Сям'я была асноўнай гаспадарчай адзінкай, род – сацыяльнай. Шлюб быў пераважна парным, стан жанчыны ў сям'і – даволі высокі. Род вёўся па мацярынскай лініі. Існавалі мужчынскія і жаночыя саюзы.

**Рэлігійныя вераванні** мала даследаваны. Вядома, што яны падобныя на палінезійскія і меланезійскія. Для мікранезійцаў таксама ўласцівы культ продкаў, элементы шаманізму і г.д.

Фальклор мікранезійцаў меў рысы і палінезійскага, і меланезійскага. На астравах **Палау** існавала пачатковая піктаграфічная пісьменнасць. Духоўная культура моцна змянілася з часу з'яўлення еўрапейцаў, а потым і амерыканцаў.

### Сучасныя этнічныя працэсы ў краінах Акіяніі

Пасля ўсталявання кантактаў з еўрапейцамі на большасці астравоў Мікранезіі, як і Меланезіі, Палінезіі, адбыліся карэнныя змены ў складзе насельніцтва і яго культуры. Многія сучасныя акіянічныя народы моцна метысаваныя.

Традыцыйны грамадскі лад практычна цалкам знік у **гавайцаў, таіцян, маары** Новай Зеландыі, імкліва разбураецца і на іншых



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выспах. Часткова ён захоўваецца ва ўнутраных раёнах вялікіх па плошчы астравоў, а на дробных трансфармацыя культуры і асіміляцыйныя працэсы ідуць вельмі хутка. Так, на марыянскіх астравах цяпер пануе варыянт іспанскай культуры, блізкі да лацінаамерыканскага.

Моцна змянілася матэрыяльная культура. Шырока прымяняюцца металічныя прылады працы. Найбольшыя змены адбыліся ў адзенні, касцюм амаль цалкам стаў еўрапейска-амерыканскім. А вось планіровачна-архітэктурныя прынцыпы пабудовы жылля ў многіх раёнах яшчэ захоўваюцца.

На многіх астравах захоўваюцца традыцыйныя сацыяльныя ўстоі, былая эліта па ранейшаму захоўвае сваё пануючае становішча.

Хрысціянізацыя, на некаторых астравах фармальная, адбылася практычна паўсюдна. Традыцыйныя вераванні губляюць сваю цэльнасць і прыходзяць да заняпаду.

На некаторых астравах сёння склалася шматнацыянальнае грамадства. У каланіяльны перыяд Новая Каледонія стала месцам пасялення французскіх катаржан, і сёння тут склалася **франка-каледонская** абшчына, якая складае 37% насельніцтва.

На Гавайскіх астравах амерыканцы і японцы складаюць прыблізна па адной трэцяй частцы, а гавайцы – толькі дзесятую частку насельніцтва. Падобная сітуацыя ў Новай Зеландыі, дзе карэннага насельніцтва (маары) налічваецца толькі 9,7%, а англа-новазеландцаў пражывае 75%.

Большасць астраўных груп Акіяніі сёння з'яўляюцца незалежнымі дзяржавамі.

**Пытанні для самакантролю:**

- Якія астравы ўваходзяць у склад Мікранезіі?
- Дайце антрапалагічную і лінгвістычную характарыстыку мікранезійцаў.
- На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця знаходзіліся мікранезійцы да прыходу еўрапейцаў?
- Чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі, склад насельніцтва ў Заходняй і Усходняй Мікранезіі?
- Чаму не ўсе мікранезійцы маюць права разам прымаць ежу?
- На якіх астравах існавала пачатковая піктаграфічная пісьменнасць?



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

- Якія этнічныя працэсы ўласцівы сучасным этнасам Акіяніі?
- Як склалася франкакаледонская абшчына?
- Чым падобная этнадэмаграфічная сітуацыя на Гавайскіх астравах і ў Новай Зеландыі?

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Пры вывучэнні тэмы "Аўстралія і Акіянія" варта звярнуць асаблівую ўвагу на структуру выкладання тэмы. Яна тыповая і пры вывучэнні этнасаў іншых рэгіёнаў свету:

- геаграфічная характарыстыка рэгіёна;
- антрапалагічная характарыстыка этнасаў;
- лінгвістычная сітуацыя;
- гаспадарка;
- жыллё і тыпы паселішчаў;
- адзенне;
- кулінарыя;
- сацыяльная структура;
- сацыялізацыя;
- палітычная структура (калі яна існавала);
- рэлігійныя вераванні;
- духоўная культура;
- сучасныя этнічныя працэсы.

Вельмі важна пры вывучэнні тэмы даваць параўнальную характарыстыку гаспадаркі, асаблівасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры, рэлігійных уяўленняў этнасаў Аўстраліі, Тасманіі, Новай Гвінеі, Меланезіі, Палінезіі і Мікранезіі. Гэта дазваляе ўбачыць эвалюцыю матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў свету на ранніх этапах станаўлення культуры чалавецтва.

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Духоўная культура насельніцтва Аўстраліі і Акіяніі: рэлігійныя ўяўленні, музыка, танцы, фальклор.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Сацыяльная арганізацыя ў народаў Аўстраліі, Новай Гвінеі, Меланезіі, Палінезіі і Мікранезіі (на выбар).

3. Тасманійская праблема.

4. Мужчынскія і жаночыя саюзы ў жыцці народаў Акіяніі.

5. Таямніцы вострава Вялікадня.

6. Сучаснае становішча этнічных супольнасцей Аўстраліі, Новай Гвінеі, Меланезіі, Палінезіі і Мікранезіі (на выбар).

7. Фарміраванне і асаблівасці сучаснай культуры англааўстралійцаў і англановазеландцаў, франкакаледонцаў (на выбар).

## ЛІТАРАТУРА

**Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў і экзаменаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступную асноўную літаратуру:**


1. Австралия и Океания в современном мире: Сб. статей. – М., 1982.
2. Алексеев В.П. География человеческих рас. – М., 1974.
3. Арутюнов С.А. Народы и культуры: развитие и взаимодействие. – М., 1989.
4. Бромлей Ю.В. Современные проблемы этнографии. – М., 1981.
5. Брук С.И. Население мира. Этнодемографический справочник. – М., 1986.
6. Бутинов Н.А. Папуасы Новой Гвинеи. – М., 1958.
7. География. Энциклопедия. – М., 1996.(пер. с англ.).
8. Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. – Мн., 1995.
9. Итс Р.Ф. Введение в этнографию: Учебное пособие. – М., 1990.
10. Кабо В.Р. Происхождение и ранняя история аборигенов Австралии. – М., 1969.
11. Кабо В.Р. Судьбы первобытной религии в XX в. Австралийский феномен // Локальные и синкретические культы. – М., 1991.
12. Кабо В.Р. Тасманийцы и тасманийскя проблема. – М., 1975.
13. Кист А. Австралия и острова Тихого океана: Пер. с англ. – М., 1980.
14. Клод-Катрин Рагаш Сотворение мира / пер. с французского. – М., 1995.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15. Народы мира. Этнографические очерки: в 18 т. – М., 1954 – 1966.
16. Народы мира: историко-этнографический справочник. – М., 1988.
17. Садохин А.П. Этнология. Учеб. словарь. – М., 2002.
18. Садохин А.П. Этнология: Уч. – 2-е изд. – М.: Гардарики, 2004. – 287 с.
19. Садохин А.П., Грушевицкая Т.Г. Этнология: учеб. для студентов высших учебных заведений. – М., 2000. – 304 с.
20. Страны и народы: Австралия и Океания. Антарктида. – М., 1981.
21. Товадов Г.Т. Этнология. Уч. для вузов. – М., 2004. – 352 с.
22. Токарев С.А. Истоки зарубежной этнографии. – М., 1978.
23. Токарев С.А. Истоки этнографической науки. – М., 1978.
24. Токарев С.А. Религия в истории народов мира. – М., 1986.
25. Токарев С.А. Религия народов мира. – М., 1976.
26. Чебоксаров Н.Н., Чебоксарова И.А. Народы. Расы. Культуры. – М., 1985.
27. Этнографические процессы в современном мире. – М., 1987.
28. Этнография: Учебник / Под ред. Ю.В. Бромлея и Г.Е. Маркова. – М., 1982.
29. Этнология / Под ред. В.В. Пименкова, Г.Е. Маркова. – М., 1994.

## СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ, НЕАБХОДНЫХ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ТЭМЫ

**Абарыгены** – карэнныя насельнікі краіны, мясцовасці (людзі, расліны, жывёлы); племя, якое згодна старажытнарымскага падання жыло каля падножжа Апенінаў.

**Англааўстралійцы** – нашчадкі перасяленцаў з Вялікабрытаніі і іншых еўрапейскіх краін ў Аўстралію.

**Англановазеландцы** – нашчадкі перасяленцаў з Вялікабрытаніі і іншых еўрапейскіх краін ў Новую Зеландыю.

**Аруба** – аўстралійскае племя, сярод жанчын якога пераважае мова жэстаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Арцэфальнае грамадства** – грамадства, у якім не існавала палітычных лідэраў і павадыроў.

**Бацькоўскі род** – саюз кроўных сваякоў, звязаных роднасцю па лініі бацькі.

**Бігмэн** – фізічна моцны аўтарытэтны мужчына, які карыстаўся павагай папуаскай абшчыны, меў некалькі жонак і арганізоўваў бяседы для ўсіх аднавяскоўцаў.

**Бумеранг** – сагнутая драўляная кідальная паліца, найчасцей падобная на серп, пашырана ў абарыгенаў Аўстраліі, старажытным Егіпце, Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі, Мексіцы.

**Гавайцы** – карэннае насельніцтва Гавайскіх астравоў.

**Гаспадарча-культурны тып** – комплекс асаблівасцей гаспадаркі і культуры, які складаецца гістарычна ў розных народаў у сходных геаграфічных умовах.

**Герантакратыя** – (грэч.) прынцып кіравання, пры якім улада належыць старэйшым.

**Дарымо** – мужчынскі дом у папуасаў.

**Ініцыяцыя** – пасвяціцельныя абрады пераводу юнакоў і дзяўчат у клас дарослых мужчын і дзяўчын.

**Інфацыт** – забойства ўласных дзяцей.

**Кувада** – (фр. выседжваць яйкі, кудахтаць як курыца) абрад звязаны з імітацыяй мужчынам акта нараджэння дзіця, дэманстрацыя ім правоў на дзяцей.

**Культ продкаў** – шанаванне памерлых бацькоў і іншых продкаў.

**Культ рэлігійны** – сістэма абрадаў, сродкаў і дзеянняў, накіраваных на абгрунтаванне веры ў звышнатуральнае.

**Магія** – вера ў здольнасці чалавека звышнатуральным чынам уплываць на натуральны ход падзей, матэрыяльныя прадметы, іншых людзей і прыроду.

**Маары** – карэннае насельніцтва Новай Зеландыі.

**Мана** – звышнатуральная сіла, у якую верылі народы Акіяніі, разлітая ва ўсёй прыродзе, уласцівая прадметам, людзям, духам памерлых людзей.

**Мацярынскі род** – саюз кроўных сваякоў, звязаных роднасцю па лініі маці.

**Племя** – адна з найбольш старажытных форм этнічнай агульнасці, якая складаецца з радоў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Раса** – група людзей, якую аб'ядноўвае агульнасць паходжання і спадчынныя падобныя фізічныя асаблівасці.

**Табу** – (палінезійск.) сістэма забарон, якія накладаюцца павадырамі, шаманамі, парушэнне якіх караецца звышнатуральнымі сіламі.

**Таіцяне** – карэннае насельніцтва Таіці.

**Тапа** – эластычны матэрыял з адмочанай і адбітай кары шаўкоўнічнага дрэва.

**Татэм** – жывёла, радзей расліна, прадмет, з'ява прыроды, якія ў радавых груп служылі аб'ектам рэлігійнага пакланення.

**Татэмізм** – вера ў звышнатуральную роднасць паміж групамі людзей і пэўнай жывёлай, радзей раслінай, прадметам ці з'явай прыроды.

**Франкакаледонцы** – нашчадкі перасяленцаў з Францыі ў Новую Каледонію.

**Фратрыя** – экзагамная група ўнутры племені.

**Шаманства** – ранняя форма рэлігіі, заснаваная на веры ў зносіны шамана, які знаходзіцца ў стадыі рытуальнага экстазу, з духамі і здольнасць прадказваць будучыню, лячыць ад хвароб і г.д.

**Шаман** – (тунгускае слова) спецыялісты па сувязі са звышнатуральным светам.

**Экзагамія** – заключэнне шлюбу паміж прадстаўнікамі рознай этнічнай прыналежнасці, літаральна з грэчаскай мовы "вонкавы шлюб".

**Этналінгвістычная непарыўнасць** – лінгвістычная з'ва адсутнасці дакладных межаў паміж рознымі мовамі, якія паступова пераходзяць адна ў адну.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА .... 3
Аўстралійскія абарыгены .... 4
Папуасы Новай Гвінеі .... 12
Этнічныя супольнасці Меланезіі .... 16
Этнічныя супольнасці Палінезіі .... 20
Этнічныя супольнасці Мікранезіі .... 23
ЗАКЛЮЧЭННЕ .... 26
Тэмы рэфератаў .... 26
ЛІТАРАТУРА .... 27
Слоўнік тэрмінаў, неабходных для вывучэння тэмы .... 28

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

**Агееў** Аляксандр Рыгоравіч

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДАЎ АЎСТРАЛІІ І АКІЯНІІ

Метадычныя рэкамендацыі
для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта

Рэдактар *І.А. Марзалюк*
Тэхнічны рэдактар *Г.М. Гладун*
Камп'ютэрная вёрстка *А.Л. Пазнякоў*
Карэктар *Г.В. Цецерукова*

Падпісана ў друк 31 .01.2007 г.
Фармат 60x84/16. Гарнітура Times New Roman Cyr.
Ум.-друк. арк. 1,9. Ул.-выд. арк. 2,2. Тыраж 80 экз. Заказ №28 .

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт
імя А.А. Куляшова", 212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1
ЛИ № 02330/278 ад 30.04.2004 г.
Надрукавана на рызографе аддзела аператыўнай паліграфіі
УА "МДУ імя А.А. Куляшова"
212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова